4. Кавалёва, М. Ц. Коласава слова ў пейзажных замалёўках // Слова і фразеалагізм у кантэксце: зб.арт. – Мінск: Народная асвета. –1983. – 47 с.

5. Колас, Я. Новая зямля. Сымон-музыка: паэмы / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1986. – 447 с.

6. Навуменка, І. Я. Якуб Колас. Нарыс жыцця і творчасці / І. Я. Навуменка. – Мінск: Народная асвета, 2003. – 132 с.

7. Сукора Н. Магія колеру / Т. Сукора // Настаўніцкая газета. – 2018. – № 14. – С. 15.

## ТАПОНІМЫ ЯК СРОДАК АДЛЮСТРАВАННЯ ЎМОЎ ЖЫЦЦЯ І ЕДНАСЦІ З ПРЫРОДАЙ НАСЕЛЬНІЦТВА ВІЛЕЙСКАГА РАЁНА

***А. Ю. Прохарава***
*ДУА "Вілейская гімназія № 2" (Вілейка)*
*Навук. кір. – В. В. Кажура, настаўнік-метадыст, магістр педагагічных навук*

**Анатацыя.** У даследаванні ажыццёўлена спроба сістэматызаваць, растлумачыць і захаваць для далейшага вывучэння паходжанне назваў асобных населеных пунктаў Вілейскага раёна, у якіх выкарыстаны словы *лес, бор, гай, гара, луг* і вытворных ад іх, а таксама тапонімы з назвамі дрэў і кустоў. Аўтар звязвае паходжанне гэтых назваў з асабівасцямі навакольнага асяроддзя, відам мясцовасці. Даследчыца не толькі канстатуе пэўныя палажэнні пра паходжанне назваў, але і запрашае да суразмоўніцтва і калектыўнага абмеркавання, калі прапануе некалькі (нават спрэчных) варыянтаў з'яўлення той ці іншай назвы.

**Ключавыя словы:** Вілейскі раён; населеныя пункты; тапонімы.

На сённяшні дзень у Вілейскім раёне налічваецца *407* населеных пунктаў. Вялікіх і маленькіх. Вядомых з далёкіх часоў і тых, што з'явіліся не так даўно. І кожны мае сваю гісторыю, свае асаблівасці.

Нас зацікавіла, *чаму* вёскі маюць такія назвы. Як яны ўзніклі? *Чаму* некаторыя назвы паўтараюцца або вельмі падобныя?

Стымулам да правядзення даследавання паслужыла выказванне Л. Лыча: *"На зямлі, напэўна, не знойдзеш ні адной назвы, якая б узнікла выпадкова. Калі задумацца, то можна зразумець, што паходзіць яна з нейкіх асаблівасцей акаляючага ландшафту, заняткаў людзей ці нават залежыць ад падзей далёкай гісторыі... Сам народ ніколі не назаве сваё паселішча словам, якое ў чымсьці не адпавядала б, а тым больш пярэчыла б ісціне*" [3, с. 6].

Так была вызначана тэма даследчай работы: *"Тапонімы як сродак адлюстравання ўмоў жыцця і еднасці з прыродай насельніцтва Вілейскага раёна"*.

*Актуальнасць* даследавання заключаецца ў тым, што са знікненем таго ці іншага населенага пункта не павінна знікнуць людская памяць. У кнізе “Памяць. Вілейскі раён” ажыццёўлена спроба патлумачыць айконімы Вілейшчыны [4, с. 659]. Аднак не з усімі тлумачэннямі можна пагадзіцца. *Дадзеная работа* – не выпадковае даследаванне, а частка праекта па вывучэнні тапанімікі Вілейшчыны, сістэматызацыі, класіфікацыі і тлумачэнні паходжання назваў населеных пунктаў Вілейскага раёна.

У *даследаванні* ажыццёўлена спроба *сістэматызаваць*, *растлумачыць і захаваць* для далейшага вывучэння паходжанне назваў асобных населеных пунктаў Вілейскага раёна, у якіх выкарыстаны словы *лес*, *бор*, *гара, луг, гай* і вытворных ад іх, а таксама тапонімы з назвамі дрэў і кустоў. У гэтым заключаецца *навізна* даследавання.

*Аб’ектам дадзенага* даследавання з’яўляюцца асобныя населеныя пункты Вілейскага раёна, *прадметам* – назвы населеных пунктаў, у якіх упамінаюцца пароды дрэў, кустарнікаў, словы *лес*, *бор*, *гара, луг*, *гай* і вытворныя ад іх.

На пачатку работы мы прапанавалі *гіпотэзу*: умовы жыцця людзей адлюстроўваюцца ў назвах населеных пунктаў.

*Мэта*: вызначыць, якія фактары ўплывалі на ўзнікненне назваў асобных населеных пунктаў Вілейскага раёна.

*Задачы*:

1) выявіць агульныя заканамернасці ўзнікнення назваў асобных населеных пунктаў Вілейскага раёна;

2) прааналізаваць і сістэматызаваць гэтыя назвы паводле прычын, па якіх народ звязваў сваё жыццё з пэўнымі мясцінамі;

3) абгрунтаваць і параўнаць прычыны паходжання тапонімаў, якія прапануюць вучоныя, з тымі, што захаваліся сярод мясцовага насельніцтва;

4) прааналізаваць размяшчэнне вёсак з аднолькавымі або падобнымі назвамі ў Вілейскім раёне.

Нас цікавілі толькі тыя населеныя пункты, у назвах якіх упамінаюцца пароды дрэў, кустарнікаў, словы *лес*, *бор*, *луг*, *гай*, *гара* і вытворныя ад іх.

Мы налічылі ***76*** такіх населеных пунктаў, пасля размеркавалі атрыманыя назвы па адпаведных групах, каб растлумачыць, чаму з’явіліся такія найменні і чаму людзі выбіралі пэўныя мясціны для жыцця. Найбольш пашыранымі аказаліся назвы, якія ўтрымліваюць у сваім складзе словы *бор* (10), *дуб* (5), *вольха* (5), *лаза* (5). Крыху менш аказалася назваў са словамі *лес* (3), *асіна* (3), *елка* (3), *бяроза* (2), *сасна* (2), *вяз* (2), *гара* (2), *луг* (2), *верас* (2). Астатнія – па адной назве: *Замошша*, *Сліпкі, Малінаўка*, *Мурожышча*, *Падкленне*, *Чаромушкі*, *Ясянёўка*, *Гай*.

Мы лічым, што такое размеркаванне колькасці назваў невыпадковае, бо народ даўно заўважыў як лекавыя, так і аберагальныя ўласцівасці асобных дрэў і кустарнікаў.

***Табліца 1* – Назвы населеных пунктаў, у якіх упамінаюцца пароды дрэў, кустарнікаў, словы *лес*, *бор*, *гара*, *луг*, *гай* і вытворныя ад іх.**

| **Дрэвы** | **Назвы** |
|---|---|
| Лес | *Залессе, Ляскі, Лясная.* |
| Бор, гай | *Баравая, Баравыя, Бараўцы, Баркі, Барок, Боркі, Забар'е, Забор'е, Задні бор, Сухі бор; Гай.* |
| Дуб | *Дубавое, Дубішча, Дубраўка, Новадубава, Старадубава.* |
| Вольха | *Альхоўка, Альшанка, Альшынка, Альшэўцы (Альшвічы), Вольшына.* |
| Бяроза | *Бярозава, Падбярэззе.* |
| Асіна | *Асінаўка, Асовік, Восава.* |
| Лаза | *Залазоўе, Лазавец, Лазавік, Лазнякі, Лазова, Лазоўка.* |
| Сасна | *Сасноўшчына, Сосенка.* |
| Клён | *Падкленне.* |
| Чаромха | *Чаромушкі.* |
| Вяз | *Вязавец, Вязаўшчына.* |
| Елка | *Ельня, Заельнікі, Яловае.* |
| Ясень | *Ясянёўка.* |
| Гай | *Гай.* |
| **Кусты** | |
| Маліна | *Малінаўка.* |
| Верас | *Берасніха, Верасы.* |
| Мох | *Замошша.* |
| **Гара, луг, поле** | |
| Луг | *Лугавыя, Лугі.* |
| Мурог | *Мурожышча.* |
| Поле | *Располле.* |
| Гара | *Загараны, Пагор'е.* |
| **Спрэчныя назвы** | |
| **Сліпкі:** 1. "Сліпка – дахрысц. імя ("сляпы")". 2. *нар.*: Будынкі стаяць блізка адзін да аднаго; зліпліся. 3. *нар.*: У пачатку вёскі расла *ліпа*; вёска пачалася *з ліпкі*. | |
| **Перайменаваныя населеныя пункты** | |
| *Хамутнае – Чаромушкі; Пузава – Лясная, Залессе – Партызанскі.* | |
| **Зніклыя населеныя пункты** | |
| *Альшанка, Альшынка, Баркі, Бярозаўка, Вольшына, Вязаўшчына, Задні бор, Лазавік, Лазавыя, Лазнякі, Малінаўка (Даўгінаўскі с.с.), Малінаўка* | |

| |
|---|
| *(Любанскі с.с.), Пагор'е (Даўгінаўскі с.с.), Пагор'е (Касцяневіцкі с.с.), Сухі бор, Шкляны Луг, Яловае, Ясянёўка* |

Найперш мы звярнулі ўвагу на тое, што колькасць назваў са словамі *"лес"*, *"луг"* аказалася амаль аднолькавай: *"лес"* – 3, "*луг*" – 2. Гэта пацвярджае думку, што ў даўнія часы тэрыторыя сённяшняга Вілейскага раёна засялялася раўнамерна: людзі абжывалі або адкрытыя мясціны, або тэрыторыі сярод лесу. І на тое былі свае прычыны. Назвы *Залессе*, *Ляскі*, *Лясная* сведчаць, што адны людзі сяліліся ў лесе або недалёка ад яго, за лесам [1, с. 200], дзе было многа звяроў, птушак, грыбоў, ягад, якія чалавек выкарыстоўваў у ежу, а са звярыных скур шыў вопратку. Дрэва ішло на пабудову жылля, выкарыстоўвалася для яго абагрэву і прыгатавання ежы. Да таго ж у лесе чалавек мог схавацца ад ворага або ўкрыцца ад небяспекі.

Другія выбіралі бязлесныя мясціны – палі, лугі, гарыстыя ўчасткі, дзе было многа травы. Там людзі разводзілі жывёлу, апрацоўвалі зямлю, сеялі збожжа, касілі сена. Таму і з'явіліся вёскі *Лугавыя*, *Лугі* [1, с. 210], *Мурожышча* [1, с. 247], *Пагор'е* [1, с. 295], *Располле* [1, с. 300].

Прааналізаваўшы тапонімы Вілейскага раёна, якія змяшчаюць словы *лес*, *бор*, *гай, гара, луг* і вытворныя ад іх, а таксама тапонімы з назвамі дрэў і кустоў, мы прыйшлі да вываду, што для жыцця людзі выбіралі месцы, дзе раслі тыя дрэвы, якія валодалі пэўнымі лекавымі і aберагальнымі ўласцівасцямі і дапамагалі чалавеку.

Яшчэ мы высветлілі, што паходжанне назваў вёсак у даследаваннях вучоных і паведамленнях мясцовага насельніцтва даволі часта супадае. Аднак ёсць і пэўныя адрозненні [2, с. 96].

Акрамя гэтага мы выдзелілі ***3*** населеныя пункты, першапачатковыя назвы якіх па пэўных прычынах (*немілагучнасць, супадзенне назвы населенага пункта і прадпрыемства*) былі зменены: *Хамутнае – Чаромушкі; Пузава – Лясная, Залессе – Партызанскі* – і атрымалі назвы, якія адпавядаюць тэме нашага даследавання.

***18*** населеных пунктаў, у назвах якіх упамінаюцца пароды дрэў, кустарнікаў, словы *лес*, *бор*, *луг*, *гай*, *гара* і вытворных ад іх, па розных прычынах (спалены ў гады Вялікай Айчыннай вайны, затоплены прадчас будаўніцтва Вілейскага вадасховішча, далучаны да іншых населеных пунктаў) сёння не існуюць. Аднак захаваныя назвы не толькі расказваюць пра далёкіх продкаў, пра ўмовы іх жыцця, пра тое, як яны ўспрымалі гэты свет, але таксама пацвярджаюць нашу гіпотэзу, прапанаваную на пачатку даследавання: умовы жыцця людзей адлюстроўваюцца ў назвах населеных пунктаў.

Завяршыўшы даследаванне, мы прыйшлі да наступных вывадаў:

- чалавек спецыяльна выбіраў месцы, дзе былі лепшыя ўмовы для жыцця, а ад гэтага месца з часам станавіўся назвай населенага пункта;

○ для жыцця людзі часта выбіралі месцы, дзераслі пэўныя дрэвы, у сілу якіх чалавек верыў і лічыў, што яны дапамагаюць;

○ і вучоныя, і мясцовыя жыхары аднолькава тлумачаць паходжанне назваў населеных пунктаў, аднак ёсць пэўныя адрозненні;

○ вёскі, у назвах якіх упамінаюцца пароды дрэў, кустарнікаў, словы *лес, бор, луг, гай, гара* і вытворныя ад іх размяшчаюцца па ўсёй тэрыторыі Вілейскага раёна і часам знаходзяцца на значнай адлегласці адна ад адной, бо прыродныя ўмовы раёна прыблізна аднолькавыя.

## Літаратура

1. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : БГУ, 1974. – 448 с.

2. Кажура, В. В. Гэта ўсё – Радзіма наша: зборнік вершаў / Віктар Кажура, Бажэна Мацюк. – Мінск : Беларус. асац. “Конкурс”, 2013. – 136 с.

3. Лыч, Л. М. Назвы зямлі беларускай / Л. М. Лыч. – Мінск : “Універсітэцкае”, 1994. – 128 с.

4. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Вілейскага раёна / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. –Мінск : БЕЛТА, 2003. – 704 с.

# ТЕМА СУДЬБЫ ЧЕЛОВЕКА В ПОВЕСТИ ПРОТОИЕРЕЯ АЛЕКСАНДРА ТОРИКА «ФЛАВИАН»

***А. О. Родионова***

*ГУО «Средняя школа №191 г. Минска»*

*Науч. рук. – И. В. Монич, учитель русского языка и литературы высшей категории*

**Аннотация.** Предметом исследования является повесть Александра Торика «Флавиан». В научной работе показана специфика времени и пространства в произведении протоиерея Александра Торика «Флавиан»; рассмотрен вопрос о том, какое значение в судьбе главного героя и героев повести имело обретение веры; раскрыт нравственный потенциал повести; показано, как происходит духовная эволюция главного героя в контексте русской православной литературы.

**Ключевые слова**: православная литература, священнический путь, психологическое состояние, духовная эволюция, обретение веры.

В настоящее время читательская и научная филологическая общественность столкнулась с новым литературным явлением: стали появляться художественные произведения, написанные как православными священниками,